**Тэкст дыктанта**

**для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**ў кадэцкае вучылішча**

**8 клас**

## Роднае слова

Яно ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці яшчэ ў маленстве. У ціхім журчанні матчыных песень-калыханак мы пачынаем улоўліваць яго своеасаблівыя формы і гучанне.

Потым у бесклапотным дзяцінстве яно ўводзіць нас у дзівосны навакольны свет. Роднае слова адкрывае нам разнастайныя цуды і таямніцы жыцця, пераносіць нас у захапляючую далячынь бабульчыных казак.

Затым у школе клапатлівыя настаўнікі расчыняюць дзверы ў бяскрайняе мора родных слоў. Па яго прасторы мы накіроўваемся ў далёкія вандраванні.

Пасля мы ўваходзім у велічныя палацы навукі, дзе паступова ўлоўліваем усю складанасць і бясконцасць сусвету.

Роднае слова - гэта не толькі найважнейшы сродак нашага духоўнага развіцця, скарбніца гісторыі народа. Яно з'яўляецца самай прыкметнай адзнакай нацыянальнай прыналежнасці чалавека. (108 слоў)

Паводле А.Крывіцкага